# “Ад змагання за пяцігодкі да фільма пра Барбі” (да 100-годдзя часопіса “Бярозка”)

Выстава падрыхтавана: Крупко Марат, студэнт 2 курса Гістарычнага факультэта БДУ на аснове дакументаў БДАМЛМ



©bdamlm.by,2024

# Уводзіны

За апошнія сто гадоў Беларусь багата змяняла сваё культурнае, палітычнае, эканамічнае і сацыяльнае аблічча. “Адліга” Новай эканамічнай палітыкі, тэрор і “зацягванне гаек” 1930-х, патрыятычны ўздым і цяжар ваенных часоў, пасляваеннае аднаўленне гаспадаркі, брэжнеўская застойная стабільнасць – усе гэтыя этапы, якія ўжо сталі гістарычнымі, адлюстраваліся ў вялікай колькасці крыніц (фотаматэрыялы, справаводства дзяржаўных устаноў, заканадаўчыя акты і інш.). Але, асобна стаіць перыядычны друк – сотні газет і часопісаў, якія чыталі сяляне ў беларускіх вёсках і працоўныя ў гарадах. Калі разглядаць часопіс як люстэрка часу, то можна ўбачыць, як шмат самых розных сведчанняў аб мінулым перапляліся на яго пажоўклых старонках – ад ўрадавых пастаноў да жартаў і загадак.

Часопіс “Бярозка” пачаў выдавацца ў 1924 г. і працягвае свой выпуск да нашых дзён. За перыяд свайго існавання ён прайшоў праз усе акрэсленыя этапы, багата адлюстраваўшы іх асаблівасці. Дарэчы, за апошняе стагоддзе часопіс тройчы змяняў сваю назву. Першай з іх у 1924 г. была “Беларускі піонэр”. Піянеры і школьнікі сапраўды прымалі ўдзел у яго выданні. З самога пачатку часопіс меў яўную ідэалагічную накіраванасць. На яго вокладцы і старонках часцяком змяшчаліся партрэты савецкіх правадыроў, яны паказваліся як любячыя бацькі для дзяцей усёй краіны. Публікаваліся заклікі да змагання за першыя пяцігодкі, сацыялістычныя перамогі. Але разам з гэтым “Бэларускі піонэр” апавядаў аб дзеячах беларускай гісторыі і культуры (напрыклад, артыкул “Францыск Скарына – першы беларускі вучоны і друкар”, “Беларускі піонэр” №11, лістапад 1925), друкаваў мастацкія і забаўляльныя творы.

Важную ролю адыгрывала абмяркаванне праблем піянерскіх арганізацый:

“[Піянерскі] атрад працуе кепска, бо ня мае добрага правадыра. Правадыр, які прыехаў да нас з гораду, зрабіў толькі тое, што выбраў чатырох камсамольцаў і сказаў ім: “працуйце!”, а сам і носу не кажа”.

“У нашым атрадзе памошнік правадыра атраду дае вельмі кепскія прыклады піянерам: пры піянерах гуляе з дзяўчатамі, лаецца кепскімі словамі (…)”.

У дзесятым нумары за май 1928 г. апавядалася, як у атрадзе імя Рыкава піянеры ладзілі касцюмаваную вечарыну (“гарнітураваны вечар”). З дапамогай матуль яны шылі сабе касцюмы, самі абіралі сабе аблічча.

З 1929 г. часопіс выдаваўся пад новай назвай – “Іскры Ільіча”. Але арыенцір заставаўся нязменным: асноўным колам чытачоў былі беларускія піянеры. З пункту гледжання сённяшнега часу цікава і нават сентыментальн выглядаюць перадваенныя адукацыйныя матэрыялы. Дзецям прапаноўвалася зрабіць постаць папугая з тонкай фанеры ці картону, змайстраваць са старой скрыні хатні цір. Апавядалася аб з’явах прыроды, “адчаго бывае дождж і снег”, пералічваліся віды драпежных рыб Паўднёвай Афрыкі, Фларыды, Мексіканскага заліва (“Іскры Ільіча” №6–7, чэрвень-ліпень 1940).

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны выданне перарвалася. У чэрвені 1945 г. часопіс выйшаў з новай нейтральнай назвай "Бярозка". У ім актыўна прадстаўлялася ваенная і ваенна-гістарычная тэматыка, постаці сучаснасці атаесамляліся з постацямі мінулага. "Вялікі палкаводзец" – такі эпітэт выкарыстоўваўся ў дачыненні да І.В.Сталіна, што павінна было наблізіць яго да старажытнарускіх князёў-абаронцаў накшталт Аляксандра Неўскага, які змагаўся з ворагамі з захаду. Знайшлося месца і для дзяцей-герояў, тых, хто быў узнанароджаны медалямі "За адвагу" і "За перамогу над Германіяй".

Пасля вайны часопіс "Бярозка" працягваў публікаваць артыкулы пра беларускіх пісьменнікаў (Цётку, Каруся Каганца, Янку Купалу), змяшчаў матэрыялы аб старажытнай гісторыі Беларусі (выдатным прыкладам з'яўляецца артыкул В. Волькага "Брацкія плямёны" пра крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў), знаёміў сваіх чытачоў з творчасцю Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Янкі Маўра, Пятра Глебкі і інш.

У канцы XX стагоддзя змест часопісу вельмі змяніўся, стаў цалкам арыентавацца на патрэбы дзіцячай аўдыторыі, прычым сучаснай аўдыторыі, якая жыве ў век інтэрнету і жадае знаёміцца з глабальнымі тэндэнцыямі. Так, у адным з нумароў за 2023 г. можна знайсці артыкул пра ляльку Барбі. Надзвычайная цікавасць да яе была выклікана паспяховым пракатам фэнтэзійнай камедыі Грэты Гервіг. "Па даных платформы TAG Wolk, калекцыі вясна–лета 2024 на 80% складаліся з ружовага колеру. Таму смела можна сказаць, што барбіколер з намі яшчэ не на адзін сезон" – заўважала аўтар артыкула. Што ж, пройдзе пэўны час, і навіна пра "барбіколер" зойме сваё месца ў бясконцым шэрагу інфармацыі па гісторыі беларускага друку.

Нягледзячы на ўсе змены, "Бярозка" не перарывае добрыя традыцыі. Як і сто гадоў таму, яна выдаецца на беларускай мове, спавядае прафесійны падыход, а таму заўсёды сур'ёзна адносіцца да надзённых праблем дзяцей – сваіх галоўных і вельмі крытычных чытачоў.

# Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва зычыць часопісу "Бярозка" не спыняць сваёй плённай працы і надалей радаваць сваімі публікацыямі дзяцей і дарослых!

©bdamlm.by,2024

*“Беларускі піонэр”, №11, 1925*




*“Беларускі піонэр”, №11, 1925*




ШТОМЕСЯЧНАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЧАСОПІСЬ
ОРГАН
ЦК ЛКСМБ І НАРКАМАСЬВЕТЫ БССР

— АДРАС РЭДАКЦЫІ —
Менск, Плац Волі, Наркамасьветы БССР.
тэлефон № 445

№ 11. ЛІСТАПАД 1925 г.

## Францыск Скарына—першы беларускі вучоны і друкар.

Роўна 400 год прайшло з таго часу, калі ў першы раз зьявіўся на Беларусі друк. Да гэтага часу ў нас ніхто і не ведаў аб друкаваных кніжках. Кніжкі пісаліся на руках. Але ясная справа, што ад рукі шмат кніжак не напішаш. І калі хто з пісьменных людзей хацеў мець сабе кніжку, то ён даставаў арыгінал гэтае кніжкі ў каго-небудзь і перапісваў. Дый наогул у тыя часы вельмі мала было такіх людзей, што мелі ў сябе на руках тыя ці іншыя кніжкі. Кніжкі меліся толькі ў багатых князёў і ў манастырох. Кніжкі пісаліся манахамі, якія мелі для гэтай справы час, і выключна на рэлігійныя тэмы.

Але вось у 1525 годзе ў г. Вільні была надрукавана першая кніжка — „Апостал“ — Францыска Скарыны. Праўда, Францыск Скарына распачаў сваю працу па выданьні кніг яшчэ раней гэтага часу. Яшчэ ў 1517 г. ён надрукаваў у беларускай мове дзьве кніжкі старога закону „Псалтыр“ і „Біблія“. Але гэтыя кніжкі друкаваліся не ў нас, на Беларусі, а ў Чэхіі, у гор. Празе. Апрача гэтых кніжак, ім было выдана, крыху пазьней ад выхаду „Апостала“, „Малая падарожная кніжыца“, дзе былі зьмешчаны розныя царкоўныя службы і малітвы для тых людзей, якія езьдзілі ў далёкую дарогу і не мелі па чым маліцца. А людзі таго часу былі вельмі богабаязныя, навука яшчэ не стаяла так высока, як цяпер. Людзі верылі ў тое, што ім гаварыла царква. Самі ні ў чым дасканала не разьбіраліся.

Цяпер паўстае пытаньне: хто такі быў Скарына па паходжаньні і чаму яго лічаць першым беларускім вучоным і друкаром?

Францыск Скарына радзіўся ў гор. Полацку. Дакладных вестак аб годзе яго нараджэньня ў навуцы няма. Прыблізна час яго нараджэньня адносяць да 1490 г., а час сьмерці — да 1550 г. Францыск Скарына выйшаў з гандлярскай сям'і. Першую асьвету ён атрымаў у сваім родным г. Полацку. Але гэтая асьвета яго не задаволіла. Францыск Скарына пасьля Полацку паехаў заграніцу, у Чэхію, дзе скончыў Кракаўскі універсытэт і атрымаў дыплём (званьне) вучонага доктара. Апрача Кракаўскага універсытэту, Францыск Скарына вучыўся яшчэ ў Італіі, дзе высока ўжо была разьвіта тагочасная культура.

Пасьля сканчэньня сваіх навук Францыск Скарына цалкам аддаецца культурна-асьветнай справе. З гэтаю мэтай ён і распачынае сваю друкарскую працу на карысьць свайго простага, як ён лічыў, народу. Францыск Скарына ў сваёй працы імкнуўся да таго, каб даць для шырокіх колаў грамады ясную, у зразумелай мове, кніжку, каб магла пашыраць асьвету між гэтай грамады. Кніжкі, якія выдаваў Скарына, былі ім перакладаны з чужаземных моў. Перакладаў ён кніжкі

*“Беларускі піонэр”, №11, 1925*



### Нима павадыра.

У нас, у цёмным лесе, на лесапільным заводзе з першых дзён траўня организаваўся атрад юных піонэраў імя Томскага.

Атрад працуе кепска, бо ня мае добрага павадыра. Павадыр, які прыехаў да нас з гораду, зрабіў толькі тое, што выбраў чатырох комсамольцаў і сказаў ім „працуйце“, а сам і носу не паказа.

Час ідзе, а мы застаемся без павадыра.

**А. Часнык.**

### Наша сувязь з вёскай.

**В. Кацнэльсон**

### Часта зьмяняюць павадыроў.

**Е. Ніст.**

### Піонэрскія.

### Дрэнны прыклад.

**Чырвоны гальштук.**

**Піонэр праўдзіў справе рабочае клясы—запетам Ільліча.**

*“Беларускі піонэр”, №8, 1929*



## ВЯЛІКДЗЕНЬ—СЬВЯТА НАШЫХ ВОРАГАЎ.

*“Іскры Ільіча”, № 9, 1930*



ШТОМЕСЯЧНАЯ ЧАСОПІСЬ ДЛЯ МЕНШЫХ ДЗЯЦЕЙ

ІСКРЫ ІЛЬІЧА

ОРГАН ЦК ЛКСМБ і НАРКАМАСЬВЕТЫ

Год выданьня 2-гі

№ 9 верасень 1930

## СЯЎБА

У колгасе „Перамога“
Час гарачы, працы многа:
Ад зары і да зары
Тут гамоняць трактары.
А з сявалак роўным строем
Жыта сыплецца буйное.
Клім, Ігнат і дзед Мікіта
Барануюць сьвежа жыта,

Каб да восені дажджлівай
Зарунела наша ніва,
Каб на лета вольны край
Меў вялікі ураджай!
Будзем дружна мы змагацца,
Працаваць, не лянавацца,
Каб расьлі, расьлі ў краіне
І колгасы і машыны!

*“Іскры Ільіча”, № 6-7, 1940*



Рыс. Волі Ермакова 13 год. Жлобінскі р-н

## Нашы майстэрні

## Адчаго бывае дождж і снег?

32

“Бярозка”, №4, 1946




“Бярозка”, №1, 1947



Зараз Міхаіл Бельскі вучыцца ў сувораўскім вучылішчы.

На фота: група выхаванцаў вучылішча. Другі справа — выдатнік вучобы суворавец Міхаіл Бельскі.

—Бяры лыжкі!.. Бяры бак!—выгаварвае горн.

Вымыўшы рукі, сувораўцы строем ідуць у сталоўку. Пасля вячэры ротамі выходзяць на прагулку. Адсюль чуюцца вясёлыя песні. Сувораўцы любяць спяваць.

Прагулка закончана. Сувораўцы спяшаюцца ў інтэрнат, каб перад сном пачысціць зубы і памыцца. І вось ужо ўсім чуцен знаёмы горн.

— «Адбой, адбой! Кладзіся спаць, спаць!» — выгаварвае труба. І зноў настала цішыня. Толькі чутны крокі дзяжурнага ды ціканне гадзінніка. Дзяжурны ўрач абыходзіць ложкі: ці ўсе добра спяць, ці няма хворых?

Але сувораўцы спяць моцным здаровым сном.

Ф. КОСЦІКАЎ

5

*“Бярозка”, №2, 1946*

# Нашы продкі

Янаў ВОЛЬСКІ

## БРАТНІЯ ПЛЯМЁНЫ



Стары Полацк.



# ЦЁТКА

Алеся АЛЕКСАНДРОВІЧ

Мал. Ф. Кругляўскага



Алаіза Пашкевіч (Цётка).

*“Бярозка”, №8, 2023*






## Праектар Хай, Барбі!

Рэкламная кампанія фільма пра Барбі стала майстар-класам у галіне маркетынгу і рап-тоўна стварыла сучасную ікону з лялькі, гісторыя якой ужо налічвае шэсць дзесяцігоддзяў.

Галоўная дзейная асоба кінастужкі, зразумела, — лялька, якая жыве ў Барбілэндзе. Аднак з-за сваіх недасканаласцей гераіня вымушана з'ехаць з казачнага горада. Вандруючы па рэальным свеце, Барбі выяўляе, што чалавечую дасканаласць можна знайсці толькі ў душы, а сапраўдную прыгажосць — у гармоніі. Гісторыя гучыць даволі банальна, але сцэнарыстам і рэжысёрам фільма з'яўляецца Грэта Гервіг, вядомая сваімі фільмамі «Лэдзі Бёрд» і «Маленькія жанчыны», што прымушае чакаць ад прэм'ернай кінастужкі больш, чым проста прыгожага кіно.

Рэкламная кампанія пачалася за год да выхаду фільма. У ліпені 2022 года ў сетку выклалі інсайдарскія фота з Марго Робі і Раянам Гослінгам на жоўтых ролікавых каньках. Цяпер іх, як і шмат іншых атрыбутаў гэтага кіно, можна набыць у крамах. Справа ў тым, што фільм «Барбі» выпусціў ужо больш за 100 калабарацый з рознымі брэндамі: ад марозіва да грабянцоў. Дарэчы, быў зняты відэакантэнт — вандроўка па доме Барбі. Пазней у Малібу з'явіўся сапраўдны дом мары, арандаваць які можна было толькі 21 і 22 ліпеня. І зусім блізка да выхаду фільма стала вядома, што з-за яго здымак у свеце ўзнік часовы дэфіцыт ружовай фарбы.

За год да прэм'еры ўжо развіваўся трэнд на барбіколер (з невялікай дапамогай калекцыі восень-зіма 2022 ад П'ерпаала П'чолі «Valentino Pink PP»). Па даных платформы TAG Wolk, калекцыі вясна-лета-2024 на 80% складаліся з ружовага колеру. Таму смела можна сказаць, што барбіколер з намі яшчэ не на адзін сезон.